*УДК 930:[943.8+947.6]«1921/1938»*

***С.А. Елізараў,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры палітологіі і гісторыі ГДТУ імя П.В. Сухога*

# ПЛОШЧА І КОЛЬКАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА БССР 1921–1938 гг. У КРЫНІЦАХ І ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Неабходнай складовай кожнай дзяржавы з'яўляецца тэрыторыя, на якую дзяржаўныя органы ўлады распаўсюджваюць сваю кампетэнцыю. Пасля заключэння Рыжскай мірнай дамовы заходнія межы ССРБ зацвердзіліся да верасня 1939 г., але ўсходняя мяжа змянялася двойчы на працягу міжваеннага перыяду (у 1924 і 1926 гг.), што дазваляе меркаваць аб стабільнай мяжы рэспублікі на захадзе і рухомай (у 1920-я гг.) – на ўсходзе.

У сувязі з рухомасцю ўсходніх межаў БССР змяняліся як памеры плошчы, так і колькасць насельніцтва краіны. Пры даследаванні пытанняў адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу БССР аўтар звярнуў увагу на тое, што ў беларускай пасляваеннай гістарыяграфіі ўжываюцца розныя лічбы адносна плошчы і колькасці насельніцтва рэспублікі (часцей за ўсё без адпаведных спасылак на крыніцы) у асобныя перыяды яе існавання: 1921 – 1923 гг.; 1924 – 1925 гг. (пасля першага ўзбуйнення БССР), 1926 – 1938 гг. (ад другога ўзбуйнення да ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР у 1939 г.).

Па-першае, гэта датычыцца памераў тэрыторыі і колькасці насельніцтва Савецкай Беларусі ў перыяд паміж Рыжскай дамовай і ўзбуйненнем БССР 1924 г. У 1953 г. С.П. Маргунскі плошчу ССРБ вызначыў (без адпаведнай спасылкі на крыніцы) у 52405 кв. км., колькасць насельніцтва – у 1544670 чал. [1, с. 48; 2, с. 40]. У 1954 г. П.Я. Севярын у артыкуле, прысвечаным узбуйненню Беларускай ССР 1924 г., памеры плошчы Савецкай Беларусі ў 1923 г. вызначыў таксама ў 52405 кв. км., а колькасць насельніцтва – у 1514 тыс. чал. (зноў без спасылак на крыніцы) [3, с. 295]. У.А. Круталевіч у 1966 г. памеры плошчы БССР вызначае ў 52398 кв. вёрст, колькасць насельніцтва ( на 1 студзеня 1921 г.) – у 1634223 чал., але пры гэтым спасылаецца на матэрыялы па адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле СССР, надрукаваных ў 1924 г. [4, с. 38]. У далейшым ў савецкай гістарыяграфіі стала дамінаваць лічба плошчы БССР 1921 – 1923 гг. у 52,3 тыс. кв. км, колькасць насельніцтва – каля 1,5 млн чал. [5, с. 185; 6, с. 137; 7, с. 111; 8, с. 261; 9, с. 432; 10, с. 279; 11, с. 8].

У сучаснай гістарыяграфіі назіраецца значна большае несупадзенне даных, якімі карыстаюцца гісторыкі пры вызначэнні памераў Савецкай Беларусі 1921–1923 гг. Частка з іх працягвае ўжываць адносна плошчы БССР гэтага перыяду лічбу 52313 (52,3 тыс.) кв. км [12, с. 55; 13, с. 104; 14, с. 90; 15, с. 28; 16, с. 131; 17, с. 181]. Аднак у навуковых выданнях сустракаюцца і іншыя лічбы: расійскі даследчык Ю.А. Барысёнак вызначае плошчу БССР 1921–1923 гг. у 52,4 тыс. кв. км [18, с.106], у шостым томе кнігі «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» ў артыкуле «Узбуйненне БССР» [19, с. 566], а таксама ў аналагічным артыкуле ў «Беларускай Энцыклапедыі» (Т. 16) С. Хоміч плошчу БССР 1921 г. вызначае ў 52398 кв. км. [20, с. 178], гэта ж лічба прыводзіцца ў першым томе энцыклапедыі «Рэспубліка Беларусь» (2005 г.) [21, с. 287]. У 52,4 тыс. кв. км вызначаюць плошчу БССР 1921 – 1923 гг. выдадзеныя ў 2008 и 2009 гг. абагульняльныя працы беларускіх гісторыкаў Інстытута гісторыі НАБ [22, с. 203; 23, с. 119]. А.К. Цітоў, як і У.А. Круталевіч, арыентуецца (са спасылкай на архіўныя матэрыялы фонду ЦВК БССР) на лічбу 52398 кв. вёрст (ці 59632 кв. км.) [24, с. 48], а П. Г. Чыгрінаў прыводзіць лічбу 59632 кв. км [25, с. 646].

У крыніцах, вядомых аўтараў ужываюцца больш разрозненыя лічбы. Першая спроба вызначыць памеры і колькасць насельніцтва Савецкай Беларусі пасля Рыжскай дамовы была зроблена беларускімі статыстычнымі органамі ў лістападзе 1921 г. Для гэтага выкарыстоўваліся вынікі сельскагаспадарчага перапісу 1917 г., а плошча памежных з Польшчай воласцей, тэрыторыі якіх часткова ўвайшлі ў склад польскай дзяржавы, вызначаліся шляхам вымярэння па карце. У выніку гэтых падлікаў плошча рэспублікі была вызначана ў 45948 кв. вёрст, а колькасць насельніцтва – 1633830 чалавек [26, спр. 432, л. 79]. Пасля далейшых удакладненняў з'явілася новая лічба – 45969 кв. вёрст, якая і стала ўжывацца практычна ва ўсіх крыніцах у якасці афіцыйнай: у дакладных запісках Дзяржплана БССР [27, спр. 61, л. 85, 97–98], справаздачы ўрада VII Усебеларускаму з'езду Саветаў [28, с. 11], выступленнях беларускіх кіраўнікоў [29, с. 2], у беларускіх [30, с. 1; 31, спр. 4325, л. 6–7] і агульнасаюзных статыстычных зборніках [32, с. 4]. Пры гэтым колькасць насельніцтва вагалася ад 1531270 да 1616074 чал. Пасля пераходу на вымярэнне плошчы ў кв. км стала ўжывацца лічба 52313 кв. км [33, с. 12] ці 52316 кв. км [34, с. 117].

Разам з тым у першым, па сутнасці, інфарматыўным і грунтоўным статыстычным зборніку па адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле Саюза ССР (1924 г.) плошча БССР 1921 –

1923 гг. вызначалася ў 52398 кв. вёрст [35, с. 162] . Але ў выданні гэтага зборніку ў рэдакцыі 1926 г. ужываецца стаўшая традыцыйнай лічба 52313 кв. км [36, с. 182].

У лютым 1924 г. адбылося другое пашырэнне тэрыторыі БССР. С.П. Маргунскі плошчу «новай БССР» у публікацыях 1953 г. вызначыў у 110584 кв. км. з насельніцтвам 4171886 чалавек. [1, с. 48; 2, с. 40]. Лічбу 110584 кв. км выкарыстоўвае ў сваім артыкуле і П.Я. Севярын (колькасць насельніцтва – 4,2 млн чал.) [3, с. 295], а таксама, спасылаючыся на гэты артыкул, і У. А. Круталевіч [4, с. 46]. У манаграфіі (1966 г.) С.П. Маргунскі прыводзіць ужо дзве лічбы адносна плошчы БССР 1924 – 1925 гг. – 110684 кв. км і 109950 кв. км [37, с. 63, 75]. У далейшым у публікацыях беларускіх савецкіх гісторыкаў замацаваліся лічбы 110, 5 тыс. кв. км и 4,2 млн (4171900, 4170 тыс., 4171 тыс.) чал. [5, с. 185; 6, с. 137; 8, с. 264; 9, с. 433; 10, с. 279], [11, с. 8]. У асобных выпадках даследчыкі арыентаваліся на вызначэнне плошчы рэспублікі ў 110,6 тыс. кв. км [7, с. 112] ці 109764 кв. км [38, с. 6].

У постсавецкай гістарыяграфіі адносна колькасці насельніцтва БССР 1924 – 1925 гг. разыходжанняў няма – колькасць жыхароў краіны ў 4,2 млн чал. сумненняў не выклікае. А вось адносна вызначэння памераў тэрыторыі БССР 1924 – 1925 гг. па-ранейшаму існуюць розныя меркаванні. Часцей за ўсё ў выданнях апошніх дзесяцігоддзяў памеры тэрыторыі Савецкай Беларусі пасля першага ўзбуйнення вызначаюцца ў 110584 кв. км [13, с. 105; 14, с. 91; 15, с. 29; 17, с. 184; 18, с. 108; 19, с. 567; 20, с. 178; 25, с. 658]. Але некаторыя даследчыкі ў сваіх працах карыстаюцца лічбай 110, 5 тыс. кв. км [12, с. 57; 21, с. 293; 23, с. 121; 39, с. 172; 40, с. 192].

У крыніцах 1920-х гг., вядомых аўтару, сустракаецца значна большая разнастайнасць звестак аб плошчы і колькасці насельніцтва БССР узору 1924 г. У дакладах Дзяржплана БССР ураду рэспублікі ў 1924 г., матарыялах да дакладу СНК на 2-й сесіі ЦВК БССР (ліпень 1924 г.) плошча Савецкай Беларусі вызначалася ў 99200 кв. вёрст, колькасць насельніцтва – 3880 (ці 3759) тыс. чал.; 3859102 чал. [27, спр. 61, л. 85, 97–98; 41, спр. 422, л. 152]. У той жа час у выступленні перад беларускімі студэнтамі Масквы 19 кастрычніка 1924 г. кіраўнік беларускага урада І.А. Адамовіч казаў аб 97830 кв. вёрстах тэрыторыі ўзбуйненай БССР з насельніцтвам 4147429 чалавек [28, с. 2]. А вось ў надрукаванай справаздачы СНК БССР VII Усебеларускаму з’езду Саветаў (май 1925 г.) з’явіліся і сталі найбольш распаўсюджанымі ў пасляваеннай гістарыяграфіі лічбы памераў плошчы і колькасці насельніцтва БССР 1924 – 1925 гг.: па тэрыторыі – 96448 кв. вёрст ці 110584 кв. км, па насельніцтве – 4171886 чал. [28, с. 15].

Разам с тым у 1920-я гг. у статыстыцы і дакументах часта выкарыстоўвалі і дзве іншыя лічбы – 109764 кв. км (ужывалі беларускія статыстыкі) [42, с. 2; 43, с. 46; 44, с. 11], і 109950 кв. км (прымяняў Дзяржплан БССР у 1926 г.) [45, с. 132], [46, спр. 944, л. 84].

У даволі буйным і прафесійна падрыхтаваным спецыялістамі ЦСК СССР зборніку (1926 г.) плошча БССР вызначана ў 96974 кв. вёрст, што, па падліках складальнікаў зборніка, адпавядала лічбе 110356 кв. км [47, с. 38].

Адносна памераў тэрыторыі і колькасці насельніцтва БССР у крыніцах 1920-х гг. сустракаюцца таксама і іншыя лічбы: даведнік «Вся Белоруссия» (1925 г.) плошчу рэспублікі вызначае ў 112920 кв. км, колькасць жыхароў – 4172000 чал. [48, с. 213], а даведнік «Административно-политическое строение СССР» (1926 г.) адпаведна 111234 кв. км і 4454673 чал. [36, с. 182].

На погляд аўтара, наяўнасць розных лічбавых паказчыкаў памераў тэрыторыі ўзбуйненай БССР магчыма растлумачыць наступнымі прычынамі. Па-першае, складанасцямі, якія маглі прывесці да пэўных хібаў пры вызначэнні памераў тэрыторый, далучаных да БССР. Адпаведна пастанове Прэзідыума ВЦВК «О передаче Белоруссии районов с преобладающим белорусским населением» (3 сакавіка 1924 г.) да БССР са складу Віцебскай губерні «по границам старого административного деления» пераходзілі поўнасцю 8 паветаў. Але на пачатку 1924 г. з гэтых 8 паветаў самрэч існавала толькі 4, паколькі ў выніку павятова-валасной рэформы ў 1922 – 1923 гг. 4 паветы былі ліквідаваны, прычым адзін з іх – Суражскі – увайшоў у склад Веліжскага павета, які пераходзіў да Пскоўскай губерні. Са складу Гомельскай губерні гэтай пастановай ВЦВК да Савецкай Беларусі далучаліся 6 паветаў поўнасцю, а таксама з Рэчыцкага павета 7 валасцей поўнасцю і часткі 3-х валасцей. Але і ў Гомельскай губерні была ажыццёўлена павятова-валасная рэформа, у выніку чаго з гэтых 6 паветаў 2 паветы (Быхаўскі і Чавускі) таксама былі ліквідаваны. Адначасова ў гэты перыяд 2 валасці Клімавіцкага павета перайшлі да Смаленскай губерні. Змяніліся і межы Рагачоўскага павета: частка яго тэрыторыі (Чачэрская воласць) увайшла ў склад Гомельскага павета, а частка Рэчыцкага павета, наадварот, была далучана да Рагачоўскага павета. Са складу Смаленскай губерні да БССР перадаваліся Горацкі павет (поўнасцю), 3 валасці (поўнасцю) і часткі 3-х валасцей Мсціслаўскага павета. У сувязі з тым, што з Гомельскай, Смаленскай і Пскоўскай губернямі дакладныя лініі размежавання замацаваны не былі, для акрэсленага паваласнога вызначэння межаў стваралася камісія ў складзе прадстаўнікоў гэтых губерняў і БССР з абавяз-

ковым зацвярджэннем яе рашэнняў ЦВК БССР і ЦВК РСФСР [49, с. 34–39, 41].

На карысць гэтай версіі варта прывесці наступныя факты. Так, калі даведнік, выдадзены беларускім статыстычным бюро ў 1925 г., плошчу Рагачоўскага павета ў складзе БССР вызначыў у 4729 кв. вёрст, дык агульнасаюзны даведнік 1926 г. – у 4020 кв. вёрст, Клімавіцкага – адпаведна 3711,4 і 2975 кв. вёрст, Суражскага – 654,2 і 407 кв. вёрст, далучаных да БССР частак Мсціслаўскага павета – 983,7 кв. і 819 кв. вёрст, а частак Рэчыцкага павета, стаўшымі беларускімі, – 3165,7 і 3813 кв. вёрст [30, с. 1], [47, с. 38].

Па-другое, разнастайныя лічбы памераў плошчы рэспублікі з'яўляюцца вынікам розных методык, якімі карысталіся пры пераводзе адной адзінкі (кв. вёрсты) у іншую (кв. км). Так, у справаздачы СНК БССР VII Усебеларускаму з'езду Саветаў і ў двух статыстычных даведніках плошча БССР у кв. вёрстах была вызначана аднолькава – 96448, а у перакладзе на кв. км у першым выпадку ўжывалася лічба 110584 [28, с. 15], у другім – 109764 [42, с. 2; 43, с. 46].

Наўрад ці якую-небудзь ролю адыгралі падзеі, звязаныя з удакладненнем беларуска-украінскіх межаў, якія ажыццяўляліся на працягу 1924 – 1927 гг., таму што справа была толькі ў абмене бакамі невялікіх тэрыторый з мэтай «спрямления границ и построения административного управления» (Засінцоўскі сельсавет Каралінскага раёна Мазырскай акругі БССР і малая частка Оўруцкага раёна Карасценскай акругі УССР) [50].

У снежні 1926 г. адбылося другое ўзбуйненне БССР за кошт уключэння ў склад рэспублікі Гомельскага і Рэчыцкага паветаў. С.П. Маргунскі ў работах 1953 г. (без адпаведных спасылак) на плошчу БССР 1927 г. вызначае ў 126336 кв. км [1, с. 49; 2, с. 41]. У.А. Круталевіч, спасылаючыся на адпаведныя даведачныя і архіўныя матэрыялы, у рабоце 1966 г. ужывае дзве лічбы – 125704 кв. км і 125950 кв. км [4, с. 58, 62]. С.А. Польскі ў 1973 г. вызначае плошчу БССР 1927 г. у 126 тыс. кв. км [7, с. 116], А.А. Ракаў у 1974 г. – у 125704 кв. км [38, с. 6], «Гісторыя БССР» (1977 г.) – у 125,6 тыс. кв. км [10, с. 279], М.А. Камінскі – у 125,8 тыс. кв. км [11, с. 8]. У сувязі з тым, што ў снежні 1926 г. быў праведзены Усесаюзны перапіс насельніцтва, у савецкай гістарыяграфіі ўжываецца толькі выніковая лічба гэтага перапісу – 4983884 (ці каля 5 млн) чал.

У постсавецкай гістарыяграфіі па-рознаму вызначаюць памеры тэрыторыі БССР пасля другога ўзбуйнення. Часцей за ўсё ў публікацыях ужываецца адносна тэрыторыі БССР лічба 125950 кв. км (126 тыс. кв. км) [13, с. 258], [15, с. 31; 18, с. 109; 19, с. 567; 20, с. 178; 21, с. 294; 23, с. 121; 25, с. 659]. У шэрагу выпадкаў выкарыстоўваюць лічбы 125, 8 тыс. кв. км [12, с. 57; 39, с. 172; 40, с. 192], 125516 кв. км [24, с. 53]. Колькасць насельніцтва ва ўсіх выданнях, як і ў савецкі час, вызначаецца адпаведна вынікаў перапісу 1926 г.

Калі звярнуцца да крыніц, дык становішча выглядае наступным чынам. Ужо ў 1927 г. у розных матэрыялах сустракаюцца мінімум чатыры лічбы адносна плошчы БССР пасля другога ўзбуйнення. Наркам унутраных спраў А. Сташэўскі ўжывае лічбу 126344 кв. км [51, с. 103]. Аднachасова ў выдадзеным таксама ў 1927 г. даведніку СНК БССР ужо значыцца лічба 125703 кв. км [52, с. 2]. У грунтоўнай даведцы ў Камісію па раяніраванню пры ЦВК СССР (1927 г.) плошча БССР вызначаецца ў 125950 кв. км [46, спр. 1435, л. 75]. У працы буйнейшага спецыяліста па раяніраванню БССР Б.Д. Архангельскага прыводзіцца лічба 125, 5 тыс. кв. км [44, с. 16]. У 1928 г. у афіцыйных урадавых матэрыялах [53, с. 17; 54, с. 34], статыстычных даведніках [55, с. 2], дакладной запісцы СНК да ЦВК БССР «Аб частковым адміністрацыйна-гаспадарчым падзеле БССР у 1927 г.» [27, спр. 597. л. 4, 19] выкарыстоўваецца лічба 125950 кв. км. Па даным агульнасаюзнага статыстычнага зборніка па адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму дзяленню (1928 г.), плошча БССР склала 125703 кв. км [56, с. 110].

У 1929 г. у агульнасаюзных зборніках па адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле з'яўляецца новая лічба плошчы БССР – 126792 кв. км [57, с. 14; 58, с. 7]. Гэта лічба (у другім варыянце – 126, 8 тыс. кв. км) стала асноўнай ў статыстыцы 1930-х гг. і выкарыстоўвалася ва ўсіх (з вядомых аўтару) статыстычных зборніках па адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле СССР (за выключэннем выдання 1931 г., калі ўжывалася лічба 125950 кв. км) [59, с. 4; 60, с. XIII; 61, с. 13; 62, с. XIII; 63, с. 143; 64, с. 169], у іншых саюзных і рэспубліканскіх зборніках [65, с. L; 66, с. 37].

Такім чынам, калі крыніцы 1920-х гг. перш за ўсё арыентуюцца на лічбу плошчы БССР у 125950 кв. км, то ў 1930-е гг. – на 126,8 тыс. кв. км. Звесткі аб якім-небудзь пашырэнні ў гэты перыяд (ад другога ўзбуйнення да вядомых падзей 1939 г.) тэрыторыі БССР адсутнічаюць. У сувязі з гэтым аўтар лічыць, што розніца ў лічбавым адлюстраванні памераў плошчы БССР 1927–1938 гг. тлумачыцца толькі статыстычным удакладненнем і лічба 126,8 тыс. кв. км больш рэальна вызначае памеры БССР у гэты перыяд.

Прапанаваны ў артыкуле матэрыял з'яўляецца пастановачным да праблемы, і вывады не прэтэндуюць на завершанасць. Тым не менш аўтар, грунтуючыся на вывучэнні пэўнага кола крыніц, лічыць метазгодным у даведачнай і вучэбнай літаратуры ўжываць адносна БССР розных перыядаў наступныя лічбы:

1921 – 1923 гг. – 45969 кв. вёрст ці 52313 кв. км (52,3 тыс. кв. км), 1,5 млн чал.; 1924 – 1925 гг. – 96448 кв. вёрст ці 110584 (110, 6 тыс.) кв. км, 4171886 (4,2 млн) чал.; 1927–1938 гг. – 126,8 тыс. кв. км. Іншыя лічбы, якія сустракаюцца ў крыніцах адносна плошчы БССР 1921–1938 гг., магчыма выкарыстоўваць у спецыяльных навуковых даследаваннях у тых выпадках, калі яны ў крыніцах даюцца разам з іншымі, непарыўнымі з імі фактамі (напрыклад, пры адпаведнай характарыстыцы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу, прапарцыянальнасці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, шчыльнасці насельніцтва, суадносін паміж узроўнем сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця і памерамі тэрыторый і г. д.).

Літаратура і крыніцы


1. *Маргунскі, С.* Да пытання аб адміністрацыйна-тэрытарыяльнай будове БССР / С. Маргунскі // Бальшавік Беларусі. – 1951. – № 11. – С. 42 – 51.
2. *Маргунский, С.* Государственное строительство Белорусской ССР на первом этапе ее развития / С. Маргунский. – Минск: Изд-во АН БССР, 1953 – 113 с.
3. *Северин, П.Я.* Укрупнение Белорусской ССР в 1924 г. / П. Я. Северин // Исторические записки. – 1954. – № 46. – С. 289 – 296.
4. *Круталевич, В.А.* Административно-территориальное устройство БССР / В.А. Круталевіч. – Минск: Наука и техника, 1966. – 133 с.
5. Гісторыя Беларуская ССР. У 2 т. – Мінск: Выд. АН БССР, 1955 – 1958. Т. 2 / пад рэд.: С.А. Краўчанка і Н.В. Каменскай. – 1958. – 661 с.
6. История государства и права Белорусской ССР. В 2 т. / под ред.: С.П. Маргунский [и др.]; Ин-т философии и права Акад. наук БССР. – Минск: Наука и техника, 1970. – Т. 1 (1917 – 1936 гг.). – 608 с.
7. *Польскі, С.А.* Нарысы геаграфіі гарадоў Беларускай ССР (1917 – 1941 гг.) / С.А. Польскі. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1973. – 136 с.
8. Гісторыя Беларуская ССР. У 5 т. / Акад. навук БССР, Ін-т гісторыі; галоў. рэд. кал.: І.М. Ігнаценка (старшыня) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972 – 1973. – Т. 3 . Перамога Вялікай Касьтрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і пабудова сацыялізму у БССР (1917 – 1937 гг.). – 1973. – 696 с.
9. Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. У 12 т. / рэд. кал.: П.У. Броўка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БСЭ, 1969 – 1975. – Т.Х. Сошна-Фут. – 1974. – 656 с.
10. История Белорусской ССР /Акад Наук БССР, Ин-т истории; ред. кол. : И. М. Игнатенко [и др.]. – Минск: Наука и техника, 1977. – 630 с.
11. Адміністравцыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі / рэд.-склад.: М.І. Камінскі. – Мінск: Выд-ва «Бел. Сав. Энцыкл.» імя П. Броўкі, 1985. – 100 с.
12. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. / рэкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭН, 1993 – 2003. – Т.1: А – Беліца. – 1993. – 494 с.
13. Нарысы гісторыі Беларусі. У 2 ч. / М.П. Касцюк [і інш.]; Ін-т гіторыі АНБ. – Мінск: Беларусь, 1994 – 1995. – Ч. 2. – 1995. – 560 с.
14. *Марцуль, Г.С.* Гісторыя Беларусі: Насельніцтва. Фарміраванне і вызначэнне этнічных і дзяржаўна-адміністрацыйных межаў. Беларускае замежжа: вучэб. дапам. / Г.С. Марцуль, М.С. Сташкевіч. – Мінск: РІВШ пры БДУ, 1997. – 132 с.
15. *Хоміч, С.М.* Далучэнне Гомельскага і Рэчыцкага паветаў да БССР у 1926 г. / С.М. Хоміч // Весці Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі.Серыя гуманітарных навук. – 1999. – № 4. – С. 28 – 31.
16. Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы / М. Біч, Р. Гарэцкі, У. Конан [і інш.]; рэдкал.: У. Арлоў [і інш.]. – Мінск: Медисонт, 2006. – 440 с.
17. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917 – 1945 гг. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2007. – 613 с.
18. *Борисёнок, Ю.А.* Белорусско-российское пограничье в 1918 – 1944 годах / Ю.А. Борисёнок // Вопросы истории. – 2004. – № 12. – С. 105–112.
19. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. / рэкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭН, 1993 – 2003. – Т. 6. Кн. 1: Пузыны – Усая. – 2002. – 591 с.
20. Беларуская энцыклапедыя. У 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1996 – 2004. – Т. 16: Трыпалі-Хвіліна. – 2003. – 576 с.
21. Республика Беларусь: Энцыклопедия. В 6 т. / редкол.: Г.П. Пашков [и др.]. – Минск: БелЭн, 2001 – 2008. – Т. 1. – 2005. – 1040 с.
22. Нарысы гісторыі беларускай дзяржаўнасці: ХХ стагоддзе / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; М.П. Касцюк [і інш.]; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2008. – 615 с.
23. Беларусь: Народ. Государство. Время / Нац. акад. наук Беларуси; Ин-т истории; редкол.: А.А. Коваленя [и др.]. – Мінск: Беларус. навука, 2009. – 879 с.
24. *Казлоў, Л.Р.* Беларусь на сямі рубяжах / Л.Р. Казлоў, А.К. Цітоў. – Мінск: Беларусь, 1993. – 71 с.
25. *Чигринов, П.Г.* Белорусская история: научно-популярный очерк / П.Г. Чигринов. – Минск: Соврем. школа, 2010. – 928 с.
26. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НА РБ). – Фонд 48. – Воп. 1.
27. НА РБ. – Фонд 7. – Воп. 1.
28. Отчет правительства VII Всебелорусскому съезду Советов. – Минск: Изд. ЦИК БССР, 1925. – 371 с.
29. Эканамічнае становішча БССР і задачы беларускага урада: даклад старшыні СНК БССР т. Адамовіча на агульным сходзе беларускаго пралетарскага студенцтва, г. Масква, 19 кастрычніка 1924 г. // Савецкая Беларусь. – 1924. – 18 лістап.
30. Статистическая справка об укрупненной ССР Белоруссии (в границах к 1 марта 1924 г.). – Витебск: Изд-е ЦСБ Белоруссии, 1924. – 55 с.
31. НАРБ. – Фонд 30. – Воп. 1.
32. Сборник статистических сведений по Союзу ССР. 1918–1923. За пять лет работы Центрального статистического управления / ЦСУ. – Москва: Тип. М.К.Х., 1924. – XVI, 481 с.
33. Народное хозяйство Союза ССР в цифрах. Краткий справочник / ЦСУ СССР. – Москва: Тип. М.К.Х., 1924. – 350 с.
34. *Хацкевіч, А.* Раёнавантне Беларускай ССР да адзінаццатай гадавіны яе існавання / А. Хацкевіч // Савецкае будаўніцтва. – 1929. – № 11 – 12. – С.117 – 130.
35. Административно-политическое строение СССР. По материалам НКВД РСФСР. Ч. 1 – 2. / сост.: С. И. Сулькевич. – Ленинград: Известия ЦИК СССР и ВЦИК, 1924. – Ч. 1. Изменения административно-территориальных делений СССР за период с 1917 года по 1924 год. – 251 с.
36. Административно-политическое строение СССР (Материалы о территориальных преобразованиях с 1917 по 1 июля 1925 г.) / сост.: С.И. Сулькевич. – Ленинград: Тип. им. Бухарина Гос. изд-ва, 1926. – 300 с.
37. *Маргунский, С.П.* Государственное строительство БССР в годы восстановления народного хозяйства (1921 – 1925) / С.П. Маргунский. – Минск: Наука и техника, 1966. – 286 с.
38. *Раков, А.А.* Белоруссия в демографическом измерении / А.А. Раков. – Минск: Б-ка газеты «Голас Раздзімы», 1974. – 128 с.
39. *Кузнецов, И.Н.* История государства и права Беларуси / И.Н. Кузнецов, В.А. Шелкопляс. – Минск: «Дикта», 1999. – 272 с.
40. *Вішнеўскі, А.Ф.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / А.Ф. Вішнеўскі. – Мінск: «Экаперспектыва», 2000. – 314 с.
41. НАРБ. – Фонд 63. – Воп. 1.
42. Статистический ежегодник. 1924 – 1925. Вып. 1. – Минск: Изд. ЦСУ БССР, 1926. – 350 с.
43. Статистический справочник и календарь с записной книжкой для стат.-корреспондента на 1927 г. – Минск: ЦСУ БССР, 1927. – 524 с.

44. *Архангельский, Б.Д.* Укрупненная БССР / Б.Д. Архангельский. – Минск: Изд. Госплана БССР, 1927. – 82 с.
45. Районирование Белоруссии (Докладная записка Госплана БССР) // Савецкае будаўніцтва. – 1926. – № 8 – 9. – С.121 – 140.
46. НАРБ. – Фонд 6. – Воп. 1.
47. Административно-территориальный состав СССР на 1 июля 1925 г. и 1 июля 1926 г. в соответствии с довоенным делением России / под рук. В. Ефремова. – Москва: ЦСУ, 1926. – XXXII, 213 с.
48. Вся Белоруссия. Справочная книга на 1925 год. – Минск: Гос. изд-во Белоруссии, 1925. – 323 с.
49. Административно-территориальное устройство БССР: справочник. В 2 т. / Глав. арх. упр. при Совете Министров БССР, Ин-т философии и права АН БССР; редкол.: В.А. Круталевич [и др.]. – Минск: Беларусь,1985 – 1987. – Т. 1 (1917 – 1941 гг.) / сост.: Т.А. Воробьева [и др.]. – 1985. – 390 с.
50. *Елизаров, С.А.* Административно-хозяйственная реформа 20-х гг. и проблемы белорусско-украинской границы / С.А. Елизаров // Беларусь – Украіна: гісторычны вопыт узаемаадносін: Міжнар. навук. канф., Мінск, 18 – 19 сак. 2003 г. / Ін-т гісторыі НАН Беларусі; рэдкал.: У.І. Навіцкі (гал.рэд.) і інш. – Мінск, 2004. – С. 324–237.
51. *Сташэўскі, А.* Аб раёнаваньні БССР / А. Сташэўскі // Савецкае будаўніцтва. – 1927. – № 6. – С. 103–109.
52. Белорусская Советская Социалистическая Республика: История, география, экономика, культура / пред. И.А. Адамовича. – Минск: Издание СНК БССР, 1927. – VII, 528 с.
53. Материалы к докладу Совета Народных Комиссаров БССР Совету Народных Комиссаров СССР. – Минск: Изд. Управления Делами СНК БССР, 1928. – 248 с.
54. Асноўныя вынікі работы Ураду БССР. Да перавыбараў Саветаў. 1928–1929 г. – Мінск: Выданьне ЦВК і СНК БССР, 1928. – 151с.
55. Статыстычны штогоднік. 1925–1926 / Цэнтр. стат. кіраўніцтва. – Мінск, 1928. – 512 с.
56. Территориальное и административное деление Союза ССР / НКВД, Стат. отд. – Москва: Изд-во НКВД, 1928. – 167 с.
57. Административно-территориальное деление Союза ССР и список важнейших населенных пунктов с хронологическим перечнем постановлений об изменении границ губерний, областей и республик с 1917 по 1929 г. Изд. 8-е / под рук. С. М. Гурвича. – Москва: НКВД РСФСР, 1929. – 321 с.
58. Административно-территориальное деление Союза ССР. Дополнение к 8-му изданию с новейшими данными о районированных в 1929 г. областях / НКВД РСФСР, Стат. отдел. – Москва: Изд-во НКВД, 1929. – 28 с.
59. Административно-территориальное деление Союза ССР. Изд. 9-е. / НКВД РСФСР. Административная статистика. – Москва: Изд-во НКВД, 1930. – 85 с.
60. Административно-территориальное деление Союза ССР (Районы и города) / ЦИК СССР, ВЦИК. – Москва: Изд-во «Власть Советов» при Президиуме ВЦИК, 1931. – XXX, 316 с.
61. Районные центры, города и рабочие поселки Союза ССР // Справочник по административно-территориальному делению на 1 июля 1933 г. / ЦИК СССР. – Москва: Изд-во «Власть Советов», тип. ВЦИК, 1933. – 259 с.
62. Административно-территориальное деление Союза ССР на 15 июля 1934 г. / ЦИК СССР. – Москва: Изд-во «Власть Советов» при Президиуме ВЦИК, 1934. – XXVI, 350 с.
63. Административно-территориальное деление союзных республик. На 1 марта 1937 г. / ЦИК СССР; отв. ред. П.В. Туманов. – Москва: Изд-во «Власть Советов» при Президиуме ВЦИК, 1937. – XV, 256 с.
64. Административно-территориальное деление союзных республик на 1 октября 1938 г. / Информ.-стат. отдел при Секретариате Президиума Верховного Совета СССР; ред. П.В. Туманов. – Москва: Изд-во «Власть Советов», 1938. – XXIII, 327 с.
65. Социалистическое строительство СССР: Статистический ежегодник / ред.: Осинский, В.В., Краваль, И.А., Мендельсон, А.С. – Москва: ЦУНХУ Госплана СССР – В/О Союзоргучет, 1935. – LXIII, 690 с.
66. БССР. 1922–1932: стат. сб. / Упр. народного хоз. учета БССР. – Минск, 1933. – 146 с.

SUMMARY

*The article considers the matters of estimation the areas dimension and number of population of the BSSR during 1921–1938 in the soviet and post-soviet history and historic sources.*

Паступіў у рэдакцыю 12.03.2010 г.

*УДК 947.6«16/17»*

***І.Р. Вуглік,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры культуралогіі Прыватнай установы адукацыі «Інстытут сучасных ведаў імя А.М. Шырокава».*

# РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ТРАДЫЦЫЙНАЙ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ І ПОБЫТУ БЕЛАРУСКІХ СЯЛЯН XVII–XVIII стст.

Сярод сацыяльна-класавых відаў культуры этнасу для традыцыйнай культуры ўласцівы параўнальна высокі ўзровень лакальна-этнаграфічнай варыябельнасці, што было характэрна і для матэрыяльнай культуры беларускіх сялян эпохі феадалізму. Адрозненні сацыяльна-эканамічных, прыродных характарыстык розных рэгіёнаў беларускіх зямель, іх гісторыка-культурная і этнакультурная (этнаграфічная) спецыфіка абумовілі існаванне рэгіянальных адметнасцей беларускай традыцыйнай культуры дадзенага перыяду. Праблема рэгіянальнай асаблівасці беларускай традыцыйнай культуры другой паловы XIX – пачатку XX ст. даследавана дастаткова падрабязна [1, 38–44; 2], у той час як рэгіянальная спецыфіка сялянскай культуры папярэдняга часу вывучана пакуль што фрагментарна. *Мэта артыкула* – абагульненне і даследаванне асноўных кампанентаў рэгіянальнай спецыфікі матэрыяльнай культуры беларускіх сялян XVII–XVIII стст.

Істотны ўплыў на фарміраванне рэгіянальнай адметнасці традыцыйнай матэрыяльнай культуры зрабіла рэгіянальная спецыфіка эканамічных, сацыяльных умоў функцыянавання сялянскай гаспадаркі. Так, адметнай рысай эканомікі Усходняй Беларусі ў другой палове XVII–XVIII стст. была адсутнасць шырока развітой фальваркава-паншчыннай сістэмы [3, с.105–106, 177]. Адносна позняе і менш паслядоўнае правядзенне на ўсходнебеларускіх землях валочнай памеры садзейнічала частковай кансерва-